2024 - № 1 (19)

# БЕЛАРУСКІ НАСТАЎНІК

# Беларускі

настаўнік

„Беларускі настаўнік” гэта адукацыйны дапаможнік перш-наперш настаўнікам беларускай мовы ў польскіх школах. Але не толькі. Хочам, каб наш часопіс дапамагаў усім зацікаўленым беларускай адукацыяй, напрыклад, гісторыкам і географам, якія ўводзяць на ўроках элементы навучання гісторыі і геаграфіі Беларусі, але таксама Падляшша. Каб пашыраў сярод настаўнікаў веды пра Беларусь і азнаямляў з новымі метадамі навучання. Хочам, каб гэта была таксама настаўніцкая платформа абмену меркаваннямі, праблемамі, досведам.

Часопіс задуманы Аб’яднаннем у карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА. Яго ідэя ўзнікла ў час працы над „Стратэгіяй развіцця асветы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы”.

„Беларускі настаўнік” выходзіць раз на паўгода. Запрашаем да супрацоўніцтва. Калі маеце цікавыя сцэнарыі ўрокаў або пазаўрочных заняткаў, урачыстых лінеек, школьных мерапрыемстваў, экскурсій, тэатральных спектакляў, калі ў Вас ёсць цікавыя гульні і дыдактычныя матэрыялы, прапануйце іх, з дапамогай нашага часопіса, іншым. Калі ў Вас узніклі пытанні, звязаныя з навучаннем беларускай мове, пішыце.

Матэрыялы і пытанні дасылайце на наш электронны адрас **ab_ba@poczta.onet.eu**. Часопіс „Беларускі настаўнік” даступны ў Вашых школах і на нашым сайце **www.ab-ba.com.pl**.

# Ад настаўніцы

Я адпрацавала ў школе трыццаць шэсць гадоў. І ведаю, як важна настаўніку самому вучыцца, каб не толькі паглыбляць веды ў сваёй галіне, але і не стаяць у месцы, разумець сучасны свет, сваіх вучняў. «Мне ўжо за шэсцьдзесят, дык я нават іншай мовай гавару, чымсьці мае вучні, але стараюся іх зразумець. Дзеля гэтага трэба час ад часу прачытаць тое, што яны», — кажа гераіня нумара, настаўніца з Гарадка Ірэна Матысюк. Яна таксама рэкамендуе настаўнікам бываць на аўтарскіх сустрэчах, у тэатры, кіно, сваёй актыўнасцю даваць прыклад вучням: «Моладзь таксама добра бачыць, ці настаўнік сам ангажуецца ў тое, што робіць. Калі бачаць яго энтузіязм, ідуць за ім». Я поўнасцю згодная з маёй калегай. Асабісты прыклад і шчырасць у кантактах з моладдзю не менш важныя за прафесійныя веды настаўніка.

Важнасць партнёрскіх адносін з моладдзю падкрэслівае Тамара Мацкевіч, якая прапануе нам некалькі сцэнарыяў заняткаў і практыкаванняў з цыкла «Беларусазнаўства», праведзеных сёлета ў Віленскай нядзельнай школцы, якая дзейнічае пры музеі імя Івана Луцкевіча: «Тэматыка заняткаў улічвала меркаванне саміх навучэнцаў — вучняў 10-14 год. На першых занятках яны самі склалі праграму, сыходзячы з таго, якія веды ім патрэбныя для жыцця, але іх не дае ні школа, ні бацькі, ні сябры. На складанне „сваёй праграмы" быў вылучаны адмысловы час, пра які не пашкадавалі ні вучні, ні я як настаўніца: з матываванымі вучнямі і актуальнымі тэмамі працаваць лёгка і прыемна». З карыснымі парадамі дасведчанай адукатаркі мелі мы ўжо магчымасць пазнаёміцца ў «Беларускім настаўніку». Як асоба, якая многаму навучылася на курсах, арганізаваных Тамарай Мацкевіч і Таварыствам беларускай мовы, рэкамендую ўчытацца ў іх і выбраць тое, што можам зрабіць разам з вучнямі.

У нумары ёсць таксама рэцэнзія на гістарычны рэпартаж Анэты Прымакі-Онішк *Kamienie musiały polecieć*. Гэта, лічу, найважнейшая кніга для беларускай грамадскасці за апошнія дзесяцігоддзі. У нас — настаўнікаў — яна павінна быць настольнай. І варта пра яе гаварыць са старэйшымі вучнямі.

Не была б я сабою, каб на канец не падзялілася маім захапленнем тэатрам. Паглядзіце на маіх здольных акцёраў, прачытайце тэкст і, калі ласка, гуляйце са сваімі вучнямі. Навучанне гэта таксама гульня, не толькі дыктоўкі і хатнія працы.

**Аліна ВАЎРАНЮК**

# Як пайду на праўдзіву эмэрытуру...[1]



Мікола ВАЎРАНЮК



**Ірэна МАТЫСЮК** нарадзілася ў 1959 годзе ў Беластоку. Закончыла Пачатковую школу ў Гарадку, затым Агульнаадукацыйны ліцэй № 3 у Беластоку і Аддзяленне чэшскай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта. Усё дарослае жыццё працуе настаўніцай у родным наваколлі, спачатку ў Вераб'ях, а затым і да сённяшняга дня ў Гарадку.

1 Калі пайду на сапраўдную пенсію.



Малая Ірэнка ў Валілах-Станцыі (на Высранцы), 1960 г.

У Гарадок заязджаю крыху раней дамоўленай гадзіны. Паколькі я непасрэдна з ранішняга дзяжурства на Радыё Рацыя, іду ў краму па нейкую булку. Зараз за мной убягае Ірэна. «Мушу хутка тое-сёе купіць, бо потым весь дзень занятая». Пакупкі кідае ў жоўты «фальксваген гольф» на публічнай паркоўцы і кіруемся ў школу.

— **Ты не зачыніла машыну.**

— Я ніколі яе не зачыняю. У нас так жывецца, — смяецца Ірэна і вядзе мяне доўгімі калідорамі і па крутых сходах у памяшканне, дзе збіраюцца гарцэры.

**— Ірэна, ты бадай адзіная настаўніца, якую я часта спатыкаю на розных культурных мерапрыемствах: тэатральных спектаклях, сеансах кіно, канцэртах ці літаратурных сустрэчах. Зразумела, апрача маёй жонкі, але ёй, паколькі жыве ў Беластоку, лягчэй.**

— З Гарадка ў Беласток няцэлых 40 кіламетраў. Дарога, гэта не праблема. Я лічу, што настаўнікі польскай мовы ці іншых гуманітарных прадметаў прынамсі пару разоў у год павінны выбрацца на нейкае літаратурнае спатканне, ці ім той аўтар падабаецца, ці не. Каб мець кантакт з навінкамі. Столькі тае літаратуры выходзіць, што немагчыма за ўсім сачыць, але трэба адчуваць пульс культурнага жыцця. Пытанні ад публікі, дыскусія, атмасфера — усё гэта нечаму вучыць і мне, асабіста, дадае энергіі. Мне ўжо за шэсцьдзесят, дык я нават іншай мовай гавару, чымсьці мае вучні, але стараюся іх зразумець. Дзеля гэтага трэба час ад часу прачытаць тое, што яны. Таму, напрыклад, паехала



З сястрой Люцынай і мішкам перад домам у Гарадку, 1962 або 1963 г.



З сястрой Люцынай на канікулах у Калодне, 1970 або 1971 г.

на сустрэчу з маладой пісьменніцай Катажынай Барлінскай, псеўданім Пізгач, бо ведаю, што яе чытае моладзь. І як мёд на сэрца было мне тое, што ўбачыла там дзве мае вучаніцы.

— **А якія Твае любімыя кнігі?**

— Назаўсёды застанецца ў памяці тое, што мяне сфармавала, абудзіла эмоцыі. Гэта кніжкі дзяцінства: *Ania z Zielonego Wzgórza, Dzieci z Bullerbyn,* кніжкі такіх польскіх аўтараў як Эдмунд Нізюрскі, Збігнеў Ненацкі, Крыстына Сесіцка. Цяпер найбольш люблю рэпартажы. І стараюся чытаць усё, што датычыць найбліжэйшага мне свету. Так што ідэальная кніга для мяне — добры рэпартаж пра наш рэгіён. Таму, напрыклад, з вялікай прыемнасцю чытала кнігу рэпартажаў Агнешкі Паянчкоўскай (Pajączkowskiej) *Wędrowny zakład fotograficzny.*



Са сваімі гарцэрамі ў Беластоку.

**— Гарадок беражліва ставіцца да свайго мінулага. Ваша школа таксама прымае ўдзел у розных акцыях, якія маюць на мэце вярнуць памяць пра колішніх жыхароў мястэчка і навакolля, іх жыццё, заняткі, прылады, якімі карысталіся. Прычым умела ўключаеце ў гэты працэс вучняў.**

— Больш за дзесяць гадоў таму разам з Міхалам Грэсем ажыццяўлялі мы праект «Папоўка», у якім расказвалі гісторыю спаленай немцамі вёскі[2]. Мы з моладдзю запісалі інтэрв'ю з людзьмі, якія памяталі Папоўку. Мне гэтая тэма асабліва блізкая, бо адтуль сям'я маёй прабабкі — прозвішча Дзенісюк. Дзед меў там будаваць хату, але з-за вайны не паспеў.

Таксама пазнавалі супольна з Музеем *Polin* і Школай дыялогу Хельсінскай фундацыі правоў чалавека гісторыю мясцовых яўрэяў. Інфармацыі, якія збіралі дзеці пры дапамозе настаўнікаў — Элі Раманчук, Ані Кандратовіч, Аляксандра Карпюка і мяне — выкарысталі ў экскурсіі па Гарадку. Потым Альжбета Грэсь — старшыня Таварыства сяброў Гарадоцкай зямлі, яе муж і я падрыхтавалі брашуру *Wycieczka do miejsc, których już nie ma*. Наша моладзь паехала ў Варшаву, дзе за сваю працу атрымала ўзнагароду. Да зацікаўлення гэтай тэматыкай моцна спрычыніўся Лёнік Тарасэвіч[3], які раней у *Гарадоцкіх навінах* публікаваў пераклад выдадзенай у Ізраілі *Кнігі памяці гарадоцкіх яўрэяў*.

Вучым таксама дзяцей, каб цікавіліся тым, што адбываецца вакол іх. Зноў жа пры дапамозе Міхала Грэся рэалізавалі мы

2 Вёску Папоўку спалілі нямецкія жандары з пастарунка ў Гарадку 3 ліпеня 1943 года. Жыхароў — 37 асоб, у тым 16 дзяцей — расстралялі па падазрэнні ў супрацоўніцтве з савецкімі партызанамі. З пагрому ўцалела адна асоба.

3 Лявон Тарасэвіч — сусветнай славы мастак, народжаны ў 1957 годзе ў Валілах-Станцыі. У 1990 годзе ўзначаліў Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне ў Гарадоцкай гміне, якое перамагло на першых мясцовых выбарах. Ініцыяваў выданне двухмоўнага штомесячніка *Wiadomości Gródeckie/Гарадоцкія навіны*.




Вучні Пачатковай школы ў Вераб'ях з настаўніцамі: Ірэнай Матысюк і Евай Бляўскай, 1997 год.

праект «Гарадок 10 гадоў у Еўрапейскім Саюзе», у межах якога нашы вучні фатаграфавалі розныя месцы і аналізавалі, як яны памяняліся ў выніку далучэння Польшчы да Еўрасаюза. Моладзь, дарэчы, вельмі любіць фатаграфаваць. Калі хто ўмела ёю пакіруе, атрымліваюцца суперэфекты.

Данута Гаркоўская запрашае ў школу нашых выпускнікоў, якія робяць кар'еру ў свеце, а пры тым ганарацца, што выйшлі з нашай зямлі. Цыкл гэтых сустрэч называецца *Znani nieznani*. Мелі мы, напрыклад спатканні з Адамам Сяменьчыкам, паэтам, які жыве ў Лондане, Эвай Павіньскай (з дому Нос), якая закончыла археалогію і працуе дызайнер-менеджарам у буйным выдавецтве *WSIP*[4] ці з вядомым баксёрам Славамірам Лісоўскім. Аля Госцік робіць цыкл фільмаў *Absolwenci szkoły w Gródku*. Усё дзеля таго, каб паказаць моладзі, што жыццё ў малой, правінцыйнай мясцовасці не падрэзвае крылы на старце ў жыццё, а наадварот — можа быць козырам, дадаваць нешта арыгінальнае, чаго няма ў вялікіх гарадах. Некаторыя нават пакідаюць тыя вялікія гарады і пасяляюцца ў нас, прычым уносяць вельмі многа ў жыццё нашай грамады, як доктар Павел Грабоўскі, які колькі гадоў ужо апякуецца самотнымі старэйшымі жыхарамі апусцелых вёсак, дзеля якіх збудаваў хоспіс у Макаўцы. З ім таксама сарганізавалі мы сустрэчу ў школе.



Вераб'і, 1992 год.

4 *Wydawnictwo Szkolne i Pedagogiczne.*



Гарцэркі з Вераб'ёў.

**— Гэта ўсё ж адзінкі. А якія козыры дае дзецям жыццё ў невялікай мясцовасці ў Падляшскім ваяводстве?**

— Відаць штосьці дае, калі такая сям'я прафесараў біялогіі пераязджае да нас з Беластока і іх дачка вучыцца ў нашай школе. Ёсць таксама сям'я з Варшавы, якая тут пасялілася. Няхай гэта і не масавая з'ява, але даказвае, што людзі бачаць вартасць нашай зямлі. Маем тут унікальную культуру. Дапамагалі гэта ўсвядоміць этнолагі Кая Койдэр і Міхал Дэмскі, якія вялі заняткі пра колішнія святочныя абрады ў нашым рэгіёне. Безумоўна, бясцэнны ў нас кантакт з натурай. Я яшчэ ў школе ў Вераб'ях лічылі мы з дзеткамі гнёзды буслоў. Падглядалі гэтых птушак, апісвалі іх жыццё, паводзіны. Я там апекавалася экалагічнай гарцэрскай дружынай, паколькі ў мяне дадатковая адукацыя: ахова натуральнага асяроддзя.

**— Твая асноўная адукацыя — багемістыка. Як Ты туды папала?**

— Дарога была няпростай і крыху выпадковай. Я ў III Агульнаадукацыйным ліцэі ў Беластоку вельмі моцна цікавілася гісторыяй. І многа чытала. Пад уплывам лаўрэата літаратурнай Нобелеўскай прэміі Іва Андрыча зацікавілася гісторыяй Югаславіі і рашыла вывучаць сербскахарвацкую мову. Аднак на гэтую філалогію якраз у той год, калі я закончыла ліцэй, не было набору. Быў на чэшскую або балгарскую філалогію. Я выбрала першую.

**— Спатрэбілася Табе яна ў жыцці?**

— Два гады перакладала тэксты для *NOT*[5]. А яшчэ як студэнтка падзарабляла як перакладчыца сем'яў чэхаславацкіх вайскоўцаў, якія адпачывалі на польскім моры. Потым у прафесійным жыцці набытымі ва ўніверсітэце ведамі не карысталася. Толькі ў прыватным жыцці, калі выязджала ў Чэхію. Нядаўна, гады два таму, патэлефанавалі мне пагранічнікі. Патрэбны ім быў перакладчык, бо затрымалі маладога чэха, які прыехаў па ўцекачоў.

**— А як Ты стала настаўніцай на канцы свету, у Вераб'ях?**

5 Naczelna Organizacja Techniczna — федэрацыя навукова-тэхнічных асацыяцый.



З Эляй Бяляўскай у Празе, 2009г.

— Па-першае, для мяне гэта не быў канец свету, бо вярнулася ў сваё старонне. Па-другое, там працавала мая сяброўка Люцына Мушынская. Калі я яе наведала, то ўбачыла ідылію: парты стаялі ў школьным двары, пад дрэвамі. Я была вельмі здзіўлена: то так можна? І я так хачу. То прыходзь да нас, сказала дырэктарка Галіна Гапунік, якраз патрабуем паланістку.

— **Але ж ты была багемісткай, не паланісткай!**

— Нічога. У вясковых школах не такія спецыялісты працавалі. А я хутка выправіла той недахоп — стала студэнткай паслядыпломнага Аддзялення паланістыкі Вышэйшай педагагічнай школы ў Седльцах. Дарэчы, вучылася я там з Марылькай Базылюк[6] і Алінай Бурылай, якая неўзабаве стане тваёй жонкай.

— **Свет малы. Ведаю, што з Алінай вас пазнаёміла Марылька. Адкуль Ты яе ведала?**

— З Варшавы, са студэнцкага інтэрната на Смычковай. Там жыла беларуская філалогія. Многа было людзей ад нас, арганізаваліся імпрэзы, завязваліся кантакты, сяброўствы.

— **Роля інтэрната на Смычковай у інтэграцыі беларускіх студэнтаў у Варшаве чакае свайго даследчыка. Давай, аднак, вернемся да Тваёй прафесійнай дарогі.**

— У Варшаве я пісала дыпломную працу ў галіне анамастыкі. Даследавала абшар у горах Бяскідах, мясцовасці Юргуў і Чарна Гура. Вельмі мне гэта спадабалася. А яшчэ больш тое, што я пісала ў выдатнай славісткі прафесар Эвы Жэтэльскай-Фэлешка. Толькі потым я даведалася, што яна была дачкой вядомага варшаўскага педагога і падпольшчыка ў час Другой сусветнай вайны Аляксандра Камінскага, аўтара рамана *Kamienie na szaniec*, які быў групавым партрэтам польскай інтэлігенцкай моладзі,

6 Марылька Базылюк (1959-1996) — настаўніца беларускай мовы ў родных Кленіках і Пачатковай школе № 3 у Бельску-Падляшскім. Паэтка. Актыўная дзеячка беларускага студэнцкага руху ў Польшчы ў 1980-ых гадах.



Гімназія ў Гарадку, злева: Анна Кандратовіч, Анна Грыцук, Ірэна Матысюк, Тэрэса Жугай; 2010 г

што змагалася з акупантам у гарцэрскай баявой арганізацыі *Szare Szeregi* і які мы праходзілі ў школе. Да сёння шкадую, што правароніла сустрэчу са спадарыняй прафесар у Беластоку, прысвечаную яе бацьку. Неўзабаве яна памерла. Потым у Седльцах я пісала працу пра мянушкі дзяцей у Вераб'ях і ў школе ў Беластоку.

— **А як праца ў школе ў Вераб'ях?**

— Супер! Там была такая сямейная атмасфера. Усе ангажаваліся ў жыццё школы. Настаўнікі памагалі адзін аднаму. Але, з другога баку, наша дырэктарка была вельмі амбітная, пільнавала ўзроўню навучання, намаўляла настаўнікаў павышаць свае кваліфікацыі, заахвочвала кожнага вучня, каб працягваў навучанне ў сярэдняй школе. Я добра ведала не толькі кожнае дзіця, але і бацькоў. Я многа часу аддавала пазаўрочным заняткам, напрыклад вяла гарцэрскую дружыну, з якой мы многа вандравалі па ваколіцы, пазнавалі гісторыю і прыроду. Пра буслоў я ўжо казала.

— **Ты жыла на месцы ці даязджала?**

— Трохі так, а трохі так. З Гарадка ж недалёка. У Вераб'ях працавала я сямнаццаць гадоў, да закрыцця школы ў 1999 годзе.

— **Што цяпер з той школай? Марнее, як у шмат якіх іншых мясцовасцях?**

— Не. Школу купіў прафесар Войцех Сабанец з Беластока. Зрабіў там такі невялікі скансэн і капліцу. Кожны год там 15 жніўня, на Маці Божай Зельнай, служаць імшу, з'язджаюцца былыя жыхары Вераб'ёў і іх нашчадкі. Я таксама езджу, бо туды цягне. Пару добрых гадоў там жа правяла.

— **Пасля Вераб'ёў Ты стала працаваць у школе ў Гарадку, дзе мы спатыкаемся.**

— Па сутнасці я ўжо на пенсіі. Многа гадоў перапрацавала настаўніцай і бачу, як памянялася школа, як змяніліся дзеці. Калісьці былі больш цікавыя свету, ахвотна ангажаваліся ў нейкія дадатковыя заняткі. Праўда, ёсць і цяпер актыўныя вучні, але гэта адзінкі, астатніх да ўсяго трэба моцна намаўляць, паказаць ім канкрэтныя карысці. Моладзь таксама добра бачыць, ці настаўнік сам ангажуецца ў тое, што робіць. Калі бачаць яго энтузіязм, ідуць за ім. А я люблю дзяцей і сваю працу. З боку школы ёсць таксама зацікаўленне ў тым, каб я яшчэ ў нечым дапамагала, то працую. Апрача ўрокаў польскай мовы вяду, напрыклад,




На *Tour de France.*




На *Tour de France.*


Сямейная сустрэча. Ірэна Матысюк стаіць паміж бацькамі.

заняткі для хлопца з Украіны, якія дапамагаюць яму падняць эмацыйныя і грамадскія кампетэнцыі. Апякуюся таксама дзявочай дружынай уніхакея (фарбола).

— **Адна з лепшых школьных каманд у Польшчы.**

— Так, нават мелі дзяўчат у нацыянальнай зборнай. Тым не менш, гэта маргінальны спорт, не мае спонсараў. За кожны выезд трэба самім плаціць. Усё трэба хадзіць, прасіць. У выніку, не маем сродкаў, каб гуляць у рэгулярнай лізе. Ездзім толькі на турніры.

— **Адкуль у Цябе зацікаўленне спортам?**

— З дзяцінства. Бацькі любілі глядзець у тэлевізары спартовыя трансляцыі. Мама цікавілася боксам, а тата больш скачкамі ўвышыню і валейболам. Усе тады глядзелі таксама Велагонкі міру і змаганні польскіх раварыстаў з савецкімі ці дэдээраўскімі. Я і да сёння люблю велагонкі. З маім партнёрам Генкам ездзім, напрыклад, на *Tour de France* і падтрымліваем нашых: Рафала Майку ці Міхала Квяткоўскага. Пры нагодзе, наведваем вельмі прыгожыя турыстычныя месцы. Такі наш улюбёны адпачынак. Ездзім таксама на *Tour de Pologne*. Я заўсёды падтрымліваю жаночы спорт, таму трымаю пальцы не толькі за польскіх велагоншчыкаў, але і за Касю Невядомую, якая таксама вельмі моцная ў гонках на ровары. Часам спецыяльна едзем убачыць яе на этапе.

— **А сама Ты займалася нейкім відам спорту?**

— Дзюдо. Шкадую цяпер, што ў пэўны момант гэта пакінула. Ну, але ў жыцці такіх шкадаванняў накапляецца. Шкадую таксама, што кінула навуку ігры на гітары.

— **Усяго не зробіш. У Цябе і так многа занятак і зацікаўленняў. Тваё прозвішча з'яўляецца таксама на старонках *Гарадоцкіх навін.***

— Калі Дарота Сульжык стала рэдактаркай нашага гміннага штомесячніка,



Пачатковая школа ў Гарадку. Турнір уніхакея (фарбола) да 11 лістапада 2023 г.

прапанавала мне весці там моўныя парады. Я там не лічу, што гэта нейкія сур'ёзныя энцыклапедычныя веды, тым не менш у кожным нумары стараюся растлумачыць ці то слова, ці як правільна ўжыць нейкі зварот. Апошнім часам стараюся тлумачыць словы з нашай гарадоцкай мовы, якія выйшлі з ужытку, якіх ужо не разумеюць мае вучні. Напрыклад *хабар* ці *шлябан*. У хаце маіх дзядоў у Калодне была такая драўляная ляжайка, са скрыняй усярэдзіне, дзе можна схаваць пасцель ці вопратку. Многа слоў я таксама не ведаю, шукаю ў слоўніках, пытаю іншых, многа знае сястра маёй мамы Ліля. Сама пры гэтым, як бачыш, вучуся. Люблю корпацца ў слоўніках, а мой улюбёны, то *Этымалагічны слоўнік польскай мовы* Аляксандра Брукнера.

— **А маеш нейкую любімую кнігу па-беларуску?**

— Ведаеш, я ніколі не вучылася беларускай мове. Нават не ведаю чаму, бо ж навучанне беларускай мовы ў нашай школе было. Іншая справа, што яно не было ні абавязковым, ні папулярным. І мяне не запісалі. Але нейкім дзіўным чынам маю дома кніжку Сакрата Яновіча з аўтографам, датаваным на той час, калі я была вучаніцай. Не памятаю, як тая кніжка апынулася ў мяне. Відаць Сакрат быў у нас на аўтарскай сустрэчы.

— **Але ж Ты вельмі добра гаворыш па-беларуску.**

— Па-гарадоцку (*смех*). У маім дзяцінстве ўсе навокал так гаварылі. Не можна было не навучыцца.

— **Ты выхоўвалася ў Гарадку?**

— У самым цэнтры. Яшчэ стаіць дом, дзе мы жылі — каля рэчкі, пры пажарным дэпо і дарозе на гарадзішча, дзе калісьці быў рынак. Гэты дом камунальны.

— **Твае бацькі тутэйшыя?**

— Так. Мая баба з боку бацькі паходзіла са Случанкі, а дзед з Плянты каля Нараўкі. Жылі ў Валілах-Станцыі, ці як у нас кажуць на Высранцы, дзе ў 1931 годзе нарадзіўся мой тата. Добра памятае жахі вайны. Пасвіў кароў і бачыў месца ў Воўчым Грудзе, дзе немцы расстрэльвалі людзей. Пасля вайны




Турнір уніхакея (фарболу) ў Ожышу, сакавік 2024 г.

яго насіла па Польшчы. Будаваў кіно «Тон» у Беластоку, нейкі час жыў у Вроцлаве, а калі вярнуўся, быў міліцыянтам ў Гарадку. Быў працавіты, але і любіў чытаць, і знаходзіў час пагуляць з дзецьмі. Мы з сястрою вельмі любілі гуляць з ім у хованкі.

Мама была з Калодна. Мы там праводзілі ўсе канікулы. Прыязджалі стрыечныя брат і сястра. У суседнюю хату таксама прыязджалі дзеці, то было весела. Памятаю, што мая бабка была вельмі разумная, на жаль памерла ў 63 гады. У час вайны ехала ў Пясчанікі і пабачыла самотную дзяўчынку. Аказалася, што яе бацькі ў партызанах. Узяла яе дахаты. Цётка Дар'я перажыла вайну ў іх, потым жыла ў Рэмбертаве і мы ўвесь час падтрымлівалі з ёю цёплыя адносіны. А пра майго дзедка знайшла я інфармацыю ў гістарычнай кніжцы. Ён да вайны працаваў у лесе і прымаў удзел у вялікай забастоўцы. Быў моцна пабіты паліцыяй, але пра гэта сам ніколі не расказваў.

Мама працавала ў гарадоцкім Гэзсе[7]. Бачыла як я люблю чытаць кніжкі і купляла мне ўсё, што з'яўлялася ў нашай кнігарні. Я ішла каля яе і чытала па дарозе. А яшчэ ў мяне ў памяці такая карцінка са шчаслівага дзяцінства: ляжу на падлозе і чытаю кніжку. Калі забяруся пісаць успаміны, то менавіта з гэтага пачну. Але то ўжо будзе тады, калі пайду на праўдзіву эмэрытуру.

**Ужо маеш першага чытача, які чакае з нецярплівасцю. Адначасова жадаю Табе і, перш-наперш, Тваім вучням, каб Ты мела сілы і ахвоту працаваць як найдаўжэй. Дзякуй за размову.**

**Размаўляў Мікола ВАЎРАНЮК**

7 Гмінны кааператыў, *Gminna Spółdzielnia*. У Польшчы гэтую вытворча-гандлёва-паслуговую ўстанову, якая працавала ў кожнай гміне, ніхто не называў поўнай назвай, усе карысталіся абрэвіятурай.

# Голас меншасці



Мікола ВАЎРАНЮК

*Aleksander Kuryło to mój dziadek. Został zamordowany w maju 1945 roku. Przez „bandę” — tak u nas mówiono. Moja mama miała wtedy dziewięć miesięcy, ale Luda — jej o dziesięć lat starsza siostra — wszystko widziała i pamiętała*[1].

Кнігу Анэты Прымакі-Онішк можна чытаць на некалькіх пластах. Першы — крымінальны — ёсць забойства, а злачынца невядомы. Паколькі трагедыя адбываецца ў пару, калі будуецца новы пасляваенны лад, усталёўваюцца межы ў месцах, дзе іх ніколі не было, то можна казаць і пра палітычнае расследаванне. Гэта другі пласт. Гісторыю раскрывае ўнучка забітага, у выніку паўстае перад намі сямейная эпапея (трэці пласт). Чацвёрты — гістарычная панарама першых пасляваенных гадоў на Беласточчыне, на беларуска-польскім сутыку. З экскурсіямі ў мінулае і да цяперашніх дзён. І тут даходзім да чарговага пласта — псіхалагічнага трылера. Аўтарка разбіраецца не толькі з сямейнай траўмай, але і са сваімі комплексамі, якія непазбежныя, калі ты нарадзіўся і выхоўваешся ў нацыянальнай меншасці. «Бо жыццё на памежжы, — падкрэслівае




1 Aneta Prymaka-Oniszk, *Kamienie musiały polecieć. Wymazywana przeszłość Podlasia*, Wołowiec 2024, s. 13.

Анэта Прымака-Онішк, — гэта не толькі шматкультурнасць, экзотыка, добрасуседскія адносіны і ўзаемадапамога, але і напружанасць, канфрантацыі розных груп і абавязковая дэкларацыя прыналежнасці да аднае з іх». На Падляшшы галоўны падзел — рэлігійны — на «польскіх» і «рускіх»[2], прычым гэтыя грамады не роўныя. У грамадскім жыцці дамінуе, падтрыманы магутнай сілай дзяржаўнага аўтарытэту, «польскі» наратыў. «Руския» са сваімі гісторыямі, са сваім бачаннем свету, каб і хацелі, прабіцца не могуць. Іншая справа, што і не хочуць. Пра некаторыя справы больш бяспечна гаварыць толькі сярод сваіх.

Анэта Прымака-Онішк перамагае свае (нашы) комплексы ў адзіны, бадай, магчымы спосаб — працай. Кожную інфармацыю, кожны пачуты матыў, кожны ўрэшце факт яна аглядае з усіх бакоў, шукае пацвярджэння ў некалькіх крыніцах. *Jakbyś grała rolę opowiadaczki gorszego sortu — powiedziała znajoma doświadczona reporterka. — Jakby twoja historia była z zasady podejrzana i mało wiarygodna, więc musisz się wciąż podpierać uznawanymi powszechnie autorytetami, wciąż na nowo uwiarygadniać*[3]. І гэта дае пажаданы плён. Усе міфы, кормленыя дзесяцігоддзямі кожнай групай, лопаюць як бурбалкі ў святле фактаў, дакументаў. Усе гэтыя расказы каталікаў пра паўстанцкія бітвы і здрады праваслаўных, тое перакананне, што цар прывёз на Беласточчыну «рускіх», хоць у іх тыя самыя прозвішчы, што і ў «польскіх», а сем'і не толькі спрадвеку жылі адна побач аднае, але і часта радніліся. У сваю чаргу праваслаўныя лічылі, што каталікі — паны-палякі толькі і думаюць, каб пажывіцца на іх крыўдзе. Хоць тыя паны працавалі так сама ў полі, а часта былі яшчэ бяднейшыя.

Карпатлівыя пошукі ў архівах і багатая бібліяграфія робяць рэпарцёра верагодным. Але соллю кожнага рэпартажу з'яўляюцца размовы з людзьмі. Як, аднак, пайсці да чалавека, які праўдападобна ведае імёны забойцаў твайго дзеда. Або прынамсі павесіў на ім цэтлік: вінаваты, бо камунізаваў. *Proszę o wyjaśnienie, co konkretnie to oznacza, że należał do partii komunistycznej? Albo chciał w Łosośnie wprowadzać kołchozy? Garkowskiego niecierpliwią te pytania; wzrusza ramionami. — No komunizował, tak ludzie mówili*[4]. І так напісаў у сваіх успамінах Багдан Гаркоўскі, паважаны жыхар Кузніцы-Беластоцкай, ветэрынар, 1939 года нараджэння. Яны захоўваюцца як афіцыйны дакумент у Інстытуце нацыянальнай памяці ў Беластоку. Пра ўдзел свайго бацькі ў тым жа сельсавеце, што і забіты Аляксандр Курыла, нічога не напісаў.

*— Tata? Ahaaa. A więc był czlenem (członkiem) sielsowietu... — Klaszcze w dłonie ze zdziwienia. — To dlatego jeździł na zjazdy do Grodna i dostał bon na obiad, na który nie poszedł... O tym zjeździe wiele mi*

WYBORCZA.PL



Анэта Прымака-Онішк

2 https://wiadomosci.onet.pl/tylko-w-onecie/prowadzi-sledztwo-w-sprawie-zabojstwa-dziadka-o-tym-sie-glosno-nie-mowi/pd4p9j4 [доступ: 19.06.2024].

3 Aneta Prymaka-Oniszk, *Kamienie musiały polecieć*, s. 36.

4 Там жа, с. 408

*wspominał. Ale że był członkiem sielsowietu. O tym w domu nigdy się nie mówiło*[5]. І пасляваеннае падполле ў яго не страляла.

Дзеля таго, каб правесці такую размову, каб выйсці са свайго бяспечнага круга, трэба нямала адвагі. Трэба ўмець трымаць эмоцыі і ўбачыць у сваім субяседніку перш-наперш чалавека, а не прадстаўніка іншай групы. Тыя размовы, часта на здзіў аўтаркі, праходзяць у добрай атмасферы. Усе памятаюць яе блізкіх як парадачных людзей, зычлівых суседзяў. Тым не менш не мяняе гэта міфаў, калі справа прыходзіць да абагульнення, да гісторыі беларуска-польскіх адносін. Не памянялася занатоўка Багдана Гаркоўскага ў ІНП і надалей абавязвае афіцыйная версія смерці Аляксандра Курылы — камунізаваў.

Гэта, зразумела, не абазначае, што не трэба нічога рабіць, бо і так нічога не зменіцца. Наадварот, я прыхільнік падыходу, што кропля точыць камень. Дзясяткі, калі не сотні аўтарскіх сустрэч, рэцэнзіі, дыскусіі вакол кніжкі паказваюць, як яна важная і як добра напісаная. Каб напісаць такую кніжку, не хопіць працавітасці і адвагі, пра якія я тут успомніў. Патрэбны яшчэ талент. Анэта Прымака-Онішк захапіла чытачоў ужо сваёй першай кнігай пра бежанства[6]. Другой пацвердзіла сваю пазіцыю аднае з найбольш цікавых рэпарцёрак у Польшчы.

Хачу звярнуць увагу на тое, чаго рэцэнзенты наогул не кранаюць — вобразнасць апісанняў месцаў, у якіх праходзяць падзеі кнігі. Гаспадарка ў Ласосне, якую збудавалі прадзеды аўтаркі, навакольныя вёскі і шляхецкія засценкі, лугі і ўзгоркі, працятыя гасцінцамі, прыдарожныя крыжы і каплічкі — усё гэта паўстае перад чытачом як быццам фільмавыя кадры. А якія героі рэпартажу! Няма сярод іх нейкіх трафарэтных, плоскіх, якія не выклікаюць нашых эмоцый. Усе яны выразныя, характэрныя, са сваімі плюсамі і мінусамі, з няпростым лёсам. А XX стагоддзе ўмела заблытваць лёсы. Ужо тут было пра суседзяў Аляксандра Курылу і Уладзіслава Гаркоўскага, якія былі разам у Ласаснянскім сельсавеце ў 1939-1941 гадах і аднаго за гэта расстралялі, а другому ўвогуле не палічылі гэты эпізод за важны ў яго жыццяпісе. Так сама было з амаль аднагодкамі, суседам і далёкім сваяком Курылаў — Станіславам Більміным ды Юзафам Хомчыкам — старэйшым братам Вольгі Курылы, жонкі Аляксандра. Абодва былі здольныя, паканчалі школы яшчэ пры цары, геройскі змагаліся ў імператарскай арміі на франтах Першай сусветнай вайны, абодва ўзнагароджваліся і сталі афіцэрамі. Більмін — капітанам, Хомчык — маёрам. І загінулі з тых самых рук — савецкіх. Першы ў Катыні, а другі, праўдападобна, у Курапатах. Аднак ужо ў міжваенны час жылі па-рознаму. Більмін у сваім невялікім маёнтку і славе абаронцы айчыны, а Хомчык — Дзядзя Маёр, як яго называлі блізкія і аднавяскоўцы — дзесьці ў Гародні, без ніякай увагі дзяржавы. І цяпер адзін з іх — герой Кузніцкай гміны, а другі зусім забыты. Справа ў тым, што яны сапраўды былі афіцэрамі, але пасля развалу Расійскай імперыі выбралі розныя арміі. Паколькі Анэта Прымака-Онішк па-мастацку разблытвае пакручастыя і нават у сям'і прызабытыя лёсы Дзядзі Маёра, не буду тут рассакрэчваць фіналу яе пошукаў. Магу толькі намякнуць, што быў ён адным з немалой грамады ў сваім наваколлі тых, якім на руінах царскай турмы народаў «сніліся сны аб Беларусі». Пра іх нядзейсненыя мары Анэта Прымака-Онішк таксама піша.

Чым далей учытваемся ў кнігу, якая пачалася са смерці дзеда аўтаркі, тым становіцца ясней, што не столькі важнае, хто гэта зрабіў, а чаму. І не столькі, чаму ў 1945 годзе загінуў Аляксандр Курыла, гаспадар з Ласосны каля

[5] Там жа, с. 411

[6] Aneta Prymaka-Oniszk, *Bieżeństwo 1915. Zapomniani uchodźcy*, Wołowiec 2016.

Кузніцы-Беластоцкай, але чаму такое адбывалася па ўсёй Беласточчыне? Што здарылася, што з людзей павылазілі найгоршыя рысы? І чаму пра гэта доўгімі дзесяцігоддзямі нельга было гаварыць уголас? Прычым маўчаў толькі адзін бок. Другі — «польскі» — напісаў чорна-белую гісторыю пасляваенных гадоў і стаў яе эксплуатаваць у сваім нацыянальна-патрыятычным уздыме. Апагей прыйшоў разам з нацыяналістычнымі маршамі ў Гайнаўцы, якія на штандары ўзялі забойцаў у мундзірах. Сітуацыя брыняла як язва, расла пад скурай, рабілася невыноснай. *To się musi jakoś rozładować, cały czas sytuacja jest nienormalna, pełna nienawiści. Wisi nad nami jak siekiera, — казаў я ў 2016 годзе Моніцы Жміеўскай з Gazety Wyborczej*[7]. І, у пэўным сэнсе, для мяне кніжка Анэты Прымакі-Онішк гэта можа не сякера, але скальпель, яе разрэзвае тую язву.

Таму няхай так будзе, як заканчвае Анэта Прымака-Онішк свой рэпартаж: *Niech więc ta historia płynie w całej swojej złożoności, choć czasem bywa ona niewygodna.*

* * *

— Я не магла чытаць, бо падымаўся мне ціск, — кажа маці маёй сяброўкі, старэйшая жанчына, — але і не магла адкласці кніжку. Брала таблеткі ад ціску і прачытала да канца.

**Мікола ВАЎРАНЮК**

---

7 https://bialystok.wyborcza.pl/bialystok/7,87318,19614803,popiol-i-pamiec-wspomnienie-ofiar-burego-w-teatrze-rozmowa.html?_gl=1*155kbl*_gcl_au*MjAzOTg4NDEyNy4xNzEyNTIzNTM5*_ga*ODk5Njg4MDU5LjE2ODcxMTM4MzI.*_ga_6R71ZMJ3KN*MTcxODcyMzg5NC4xOC4xLjE3MTg3MjQzNzguMC4wLjA.&ga=2.113831367.1363934836.1718723894-899688059.1687113832 [доступ: 19.06.2024].

# Метадычныя матэрыялы курса «Беларусазнаўства» для дзяцей і падлеткаў




Тамара МАЦКЕВІЧ

**Тамара МАЦКЕВІЧ**
— Таварыства беларускай школы, Менск.

У гэтым артыкуле я прапаную некалькі сцэнароў заняткаў і практыкаванняў з цыкла „Беларусазнаўства", праведзеных сёлета ў Віленскай нядзельнай школцы, якая дзейнічае пры музеі імя Івана Луцкевіча. Тэматыка заняткаў улічвала меркаванне саміх навучэнцаў — вучняў 10-14 год. На першых занятках яны самі склалі праграму, сыходзячы з таго, якія веды ім патрэбныя для жыцця, але іх не дае ні школа, ні бацькі, ні сябры. На складанне „сваёй праграмы" быў вылучаны адмысловы час, пра які не пашкадавалі ні вучні, ні я як настаўніца: з матываванымі вучнямі і актуальнымі тэмамі працаваць лёгка і прыемна. Як мы разам складалі праграму, я апісваю ніжэй.

Яшчэ пры распрацоўцы заняткаў я ўлічвала сучасныя тэндэнцыі ў адукацыі, якія ўзніклі як адказ на новыя выклікі ў Еўропе і свеце пасля 2020 года. Эксперты і даследчыкі прыйшлі да высноў, што адукацыя адстае ад развіцця тэхналогій. Такі перыяд навукоўцы называюць „перыядам сацыяльнага болю". Адукацыя мусіць хутка мяняцца, і калі развіццё адукацыі будзе адпавядаць развіццю тэхналогій або апярэджваць яго, наступіць „перыяд дабрабыту".

Цяпер адукацыя не спраўляецца з новымі выклікамі і перажывае сістэмны крызіс, які яшчэ больш праявіўся падчас пандэміі. Асабліва кульгае сацыяльна-эмацыйны складнік навучання. У свеце каля 19% дзяцей школьнага ўзросту маюць праблемы са здароўем — у абсалютнай большасці з ментальным. Школа на гэта ніяк не рэагуе — няма ні адпаведных праграм, ні навыкаў у настаўнікаў, ні разумення, што з гэтым рабіць. Тое самае і з патрабаваннямі новых рынкаў працы з новымі запытамі на ўменне супрацоўнічаць, эмпатыю, маральнасць, а не толькі на веды. Традыцыйная школа мала ўвагі надае каштоўнасцям, сацыяльным і грамадзянскім кампетэнцыям вучняў, мала спрые іх самавыяўленню і творчасці. У разумных і сумленных вучняў школа не развівае амбіцыі ды лідарскія якасці — у выніку лідарамі становяцца не лепшыя. Адсюль палітычныя крызісы, карупцыя, ваенныя канфлікты, пагрозы ядзернай зброяй, інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі, рызыка чарговай сусветнай вайны.

Здавалася, што рабіць настаўнікам, як можна ўплываць на глабальныя праблемы? У мяне адказ такі — кіравацца беларускай народнай мудрасцю — рабі што можаш, і будзь, як будзе. Тэорыя маленькіх крокаў бывае больш эфектыўнай, чым чаканне мудрых загадаў і новых інструкцый.

Мы як настаўнікі маем спіс праблем і рэкамендацыі экспертаў. Шмат якія рамачныя дакументы перакладзены на беларускую мову (https://www.nastaunik.info/info/issues). Засталося праяўляць ініцыятыву і змяняць уласныя падыходы да навучання, дзяліцца поспехамі і няўдачамі з калегамі. Са свайго досведу магу сказаць, што групавая праца, праектнае навучанне, ды і просценькія хвілінныя практыкаванні на супрацоўніцтва (не на канкурэнцыю!) дазволілі моцна змяніць атмасферу ў класе. Дзеці, якія адчувалі сябе не найлепшым чынам пасля вымушанай эміграцыі, якім было цяжка стаць часткай новай супольнасці, сталі адчуваць сябе нашмат лепш, у іх з'явіліся сябры, добразычлівы асяродак і лепшае стаўленне да навучання. Мы не звяртаем увагу, але тая атмасфера, якую мы ствараем на занятках, у будучыні вызначае атмасферу ў грамадстве.

Ну і апошняе, што я хачу сказаць, што заняткі „Беларусазнаўства", „Беларуская мова", „Гісторыя Беларусі" не трэба заганяць у этна-культурнае гета. Яны павінны быць накіраваны ў будучыню. Беларусы будуць адчуваць сябе паўнавартаснай нацыяй, калі ўсё сучаснае, самае патрэбнае будзе па-беларуску. Гэта не азначае, што трэба адмовіцца ад вывучэння фальклору ды народных традыцый, але не варта абмяжоўвацца толькі імі.

Апытанне напрыканцы курса паказала, што самай папулярнай і патрэбнай падлеткі назвалі тэму „Біялагічнае і сацыяльнае ў чалавеку", дзе мы вывучалі патрэбы чалавека, разглядалі піраміду Маслоў, разбіраліся, адкуль бяруцца эмоцыі, і як імі кіраваць, што такое стрэс, гармоны, пераходны ўзрост, як „працуюць" наркотыкі, вучыліся развязваць канфлікты. Другой па папулярнасці была тэма „Энергетыка і эканамічная незалежнасць Беларусі"- там мы разглядалі структуру энергавытворчасці ў Беларусі і ў свеце, разбіраліся з экалогіяй, уладкаваннем ядзернага рэактара, радыяцыйнай бяспекай. А потым у ролевай гульні дзве групы — два Кабінеты міністраў будучай Беларусі — вырашалі, ці павінна Беларусь мець атамную станцыю.

Курс „Беларусазнаўства" ў нас быў вельмі шырокі. Не да ўсіх тэм мы дабраліся. Я дзялюся толькі некаторымі матэрыяламі, якія былі добра ўспрынятыя вучнямі. Сцэнары, а таксама асобныя практыкаванні з іх могуць быць выкарыстаныя і адаптаваныя калегамі для сваіх заняткаў.

## Занятак 1. Школа будучыні. Складаем навучальную праграму разам.

**Сцэнарыі ўрокаў**

# Тэма: РОЛЯ АДУКАЦЫІ ДЛЯ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА.

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** Папера А1, маркеры.

**Мэта:** вучні вызначаць, навошта яны вучацца, якія веды патрэбныя для жыцця, але іх не дае школа, самі складаюць праграму школы будучыні, патрэніруюцца коратка прэзентаваць свае ідэі.

**I этап. Актуалізацыя тэмы.**

Варта спытаць у вучняў, навошта яны ходзяць у школу і чаго чакаюць ад школы.

**II этап. Фармаванне больш дакладных ведаў пра сябе і свае патрэбы ў адукацыі.**

**Практыкаванне „Што вы любіце рабіць?" (праца ў групах).**

а) Узгадайце штосьці, што ў вас добра атрымліваецца, хаця і не стасуецца да школы, і што вы заўсёды робіце з задавальненнем. Выберыце які-небудзь занятак, запішыце.

б) Узгадайце, як вы прыйшлі да гэтага занятку. Навучыліся спецыяльна або ўсё выйшла само па сабе? Магчыма, вы назіралі, як гэта робяць іншыя людзі, або чыталі кнігі? Напішыце пра гэта некалькі радкоў.

в) Што, па-вашаму, дапамагло вам дасягнуць поспехаў? Якая матывацыя была ў вас? Хто-небудзь дапамагаў вам, падтрымліваў вас? Чаму вы гэтым займаліся?

г) Ці змаглі б вы навучыць сваёй любімай справе іншых? Калі так, то якім чынам? Калі не — чаму? Адкажыце некалькімі фразамі.

Удзельнікі разбіваюцца на некалькі груп па 3-5 чалавек, каб распавесці, што яны запісалі. Потым усе сядаюць у агульнае кола. Абмеркаванне пытання: „Як і чаму мы, нягледзячы на каласальную нагрузку ў школе, усё роўна навучаемся нечаму самі і цікавімся чымсьці іншым?" (Ці тыя заняткі, якія пазначалі ўдзельнікі, выкладаюцца ў школе?).

**Практыкаванне „Чаму мяне навучае...”.**

Удзельнікі разбіваюцца на чатыры групы. Кожнай з груп прапануецца адно з чатырох пытанняў:

- Чаму мяне навучае школа?
- Чаму мяне навучаюць бацькі?
- Чаму мяне навучаюць сябры?
- Чаму я навучаюся сам?

Мазгавы штурм у групах. Прэзентацыя. Абмеркаванне ў агульным коле.



**Практыкаванне „Што мусіць ведаць кожны?”**

Спіс пытанняў. Праца ў парах і тройках.

*Неабходныя папярэднія тэзы:*

Паводле футуролагаў (футуралогія — навука пра будучыню), аб’ём чалавечых ведаў падвоіўся за перыяд з 1700 па 1900 год, потым яшчэ раз

падвоіўся паміж 1900 і 1950 і яшчэ раз падвоіўся ў 1950-1970 гадах. Зараз ён падвойваецца кожныя пяць год. Калі тэмпы росту захаваюцца, то неўзабаве колькасць інфармацыі, якая ёсць у свеце, пачне падвойвацца кожныя некалькі дзён! Адсюль узнікаюць пытанні: Што менавіта з бясконцых плыняў разнароднай інфармацыі мусіць ведаць кожны?

*Настаўнік прапануе:*

Уявіце сабе сітуацыю, што ўсе навучальныя планы, праграмы, усе школьныя падручнікі нечакана зніклі. Іншымі словамі, горы навучальных матэрыялаў умомант перасталі існаваць. Цяпер уявіце, што вы вырашылі гэтую сітуацыю выправіць, і вам патрэбна скласці навучальную праграму. Праграма павінна быць цікавая не толькі для вас, але і для іншых. Можаце выбіраць любыя прадметы, тэмы і пытанні, якія лічыце неабходнымі. Няма абмежаванняў у выбары. Гэта тое, што, на ваш погляд, патрэбна ведаць і ўмець сучаснаму маладому чалавеку, каб дасягнуць поспеху ў жыцці.

Група падзяляецца на тройкі і складае свае праграмы. Пасля прэзентуе ўласныя напрацоўкі.

**Прэзентацыя работы груп.**

Настаўнік прапануе зрабіць бізнес-прэзентацыю сваіх праграм.

Настаўнік звяртае ўвагу, што такая тэхніка, калі каманда павінна коратка, за 3-5 хвілін прадставіць сваю ідэю, каб яе прадаць, называецца „пітчынг”. Гэтай тэхнікай вельмі карысна валодаць, каб у будучыні прасоўваць свае праекты.

*Пітчынг (англ. pitch — выстаўляць на продаж) — вусная ці візуальная прэзентацыя праекта з мэтай знаходжання інвестараў, гатовых фінансаваць гэты праект. Pitch з’яўляецца скарачэннем ад англ. sales pitch (гандлёвая прэзентацыя), што з’яўляецца адной з тэхнік продажу.*

Сцэнарыі ўрокаў

# Занятак 2. Роля адукацыі для чалавека і грамадства.

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** Раздаткі, вяроўка даўжынёй 8-10 метраў, звязаная абодвума канцамі, каб утварыць замкнёнае кола. Павязкі на вочы для паловы ўдзельнікаў.

**Мэта:** Вучні складуць праграму свайго навучання, дададуць туды патрэбныя для паспяховага жыцця ўменні і каштоўнасці, праверадзь свае здольнасці супрацоўнічаць у камандзе.

**I этап. Актуалізацыя ведаў.**

Узгадаем, што мы рабілі на мінулым занятку.

Магчымыя адказы:
- Аналізавалі, якія веды мне патрэбныя.
- Дзе я іх бяру (у школе, бацькі, сябры, сам).
- Потым складалі праграму школы будучыні.
- Прыйшлі да высновы, што не ўсё патрэбнае нам дае школа.
- Вучыліся прэзентаваць сваю працу („пітчынг" — прадаваць ідэю — значыць пераканаць іншых, што вы маеце рацыю).

**II этап. Навошта нам адукацыя?**

**Практыкаванне 4 куты.**

У кутах пакоя, дзе праходзяць заняткі, развешваюцца 4 надпісы. Пры патрэбе настаўнік каментуе іх.

1. **Для сябе** (каб цікавей было жыць, для самавыяўлення і развіцця).
2. **Для працаўладкавання** (каб у будучыні знайсці лепшую і больш аплатную працу).
3. **Для таго, каб арыентавацца ў складаным свеце і ўмець ладзіць з іншымі людзьмі** (умець карыстацца ўсімі прыладамі, якія патрабуюць ведаў: банкаўскімі карткамі, смартфонамі, купіць квіток, узяць крэдыт у банку, атрымаць медыцынскія паслугі..., быць такімі як іншыя — каб было пра што пагаварыць, разумець сяброў).
4. **Каб кіраваць сваім жыццём і рабіць свет лепшым...**

Вучні разыходзяцца па кутах, якія яны абралі. Кожны кут аргументуе свой выбар.

Настаўнік задае пытанне: Ці лёгка было зрабіць выбар?

— Вядома, нялёгка, бо насамрэч адукацыя існуе для таго, каб задаволіць усе 4 патрэбы. Паглядзім, якія прадметы вы вызначылі для новай беларускай школы, і ці адпавядаюць яны мэтам адукацыі.

**III этап. Інвентарызацыя праграм. Складанне агульнай праграмы.**

Прадметы, тэмы, уменні, навыкі раскладаюцца на дзве групы: важна — „валізка", не вельмі важна — „шуфлядка". Звычайна выкарыстоўваецца яшчэ „сметніца", але ў гэтым практыкаванні ёсць умова нічога не адкідаць.





**IV этап. Дадаем каштоўнасці і ўменні.**

Настаўнік прапануе дадаць да ведаў уменні і каштоўнасці (гл. Раздаткі), якія патрэбны для дасягнення чатырох мэт адукацыі.

Разыгрываюцца кампетэнцыі ў выглядзе фантаў.

Прадстаўнік групы выцягвае фант, чытае, і група вырашае, куды гэтую кампетэнцыю пакласці — ў шуфлядку ці ў валізку.

**Раздаткі.**

1. **Уменне вучыцца** — гэта здольнасць да самааналізу, да эфектыўнага размеркавання часу і інфармацыі, да канструктыўнага супрацоўніцтва з іншымі, а таксама ўменне кіраваць уласным навучаннем і кар'ерай. Яно ўключае ў сябе здольнасць спраўляцца з сумневамі і цяжкасцямі, уменне падтрымліваць свой фізічны і эмацыйны стан, а таксама фізічнае і псіхічнае здароўе, сачыць за сваім здароўем з перспектывай на будучыню, прадбачыць канфлікты і ўмець эфектыўна і канструктыўна спраўляцца з імі.

2. **Грамадзянская кампетэнцыя** — гэта здольнасць дзейнічаць як адказны грамадзянін і паўнавартасна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, абапіраючыся на сацыяльныя, эканамічныя, прававыя і палітычныя веды, а таксама сачыць за глабальнымі падзеямі.

3. **Прадпрымальнасць** — гэта здольнасцьператвараць ідэі ў дзеянні. Яна заснавана на творчасці, крытычным мысленні і рашэнні праблем, праяўленні ініцыятывы і настойлівасці, здольнасці супрацоўнічаць, працаваць над праектамі, якія маюць культурную, сацыяльную або фінансавую каштоўнасць.

4. **Культурная дасведчанасць і самавыяўленне** — разуменне, як развіваецца ўласная ідэнтычнасць і культурная спадчына ў межах сусветнай культурнай разнастайнасці. Павага да разнастайнасці і іншых культур, разуменне таго, што з дапамогай творчасці праяўляюцца ідэі і сэнсы. Здольнасць выказваць і інтэрпрэтаваць вобразныя ўяўленні, перажыванні і эмоцыі з эмпатыяй у дачыненні да розных мастацкіх і культурных форм. Разуменне і ўменне перадаць ідэі ў такіх мастацкіх формах як тэатр, кіно, танец, відэагульні, жывапіс і дызайн, музыка, традыцыйнае мастацтва, архітэктура і мастацтва ў змешаных формах. Этычны і адказны падыход да інтэлектуальнай і культурнай уласнасці, зацікаўленасць светам, жаданне набываць культурны вопыт. Кампетэнцыя грунтуецца на ведах пра мясцовую, нацыянальную, рэгіянальную, еўрапейскую і сусветную культуру і яе праяўленне, у тым ліку мову, спадчыну, традыцыі, культурныя прадукты, і як яны могуць уплываць адны на другія, а таксама на пачуцці чалавека.

5. **Медыяпісьменнасць** — гэта здольнасць знаходзіць, аналізаваць, ацэньваць паведамленні ў розных відах медыя, жанрах і формах, а таксама ствараць такія паведамленні. Галоўныя складнікі медыяпісьменнасці звязаныя з уменнямі: атрымаць бесперашкодны доступ да інфармацыі; крытычна яе асэнсаваць (прааналізаваць); ацаніць інфармацыю з гледзішча закладзенага ў ёй паслання, патрэбнасці, адпаведнасці каштоўнасцям; адказна і этычна карыстацца медыяпрасторай і прымаць удзел у яе стварэнні.

6. **Супрацоўніцтва** — эфектыўнае ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі і ўменне працаваць у розных камандах. Гэта азначае ўменне і гатоўнасць звяртацца па дапамогу; выслухоўваць чужое меркаванне і згаджацца з іншымі прапановамі; падчас працы каманды над заданнем убудоўваць сваю індывідуальную частку працы ў агульную працу групы, а таксама вызначаць свой уклад і ацэньваць калектыўны вынік як свой уласны.

**V этап. Навучаемся супрацоўніцтву.**

Настаўнік падсумоўвае навучальную праграму, якую склалі для сябе вучні і абяцае ўлічыць усё гэта на занятках.

Прапануе адразу пачаць з навучання супрацоўніцтву. Бо гэта бадай асноўнае ўменне, якое спатрэбіцца для добрага працаўладкавання.

Практыкаванне „Квадрат".

*Апісанне:*

1. Пакласці вяроўку на падлогу так, каб яна ўтварыла прыблізнае кола. Папрасіць сямёра ці больш добраахвотнікаў стаць на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго наўкол вяровачнага кола. Завязаць усім вочы і даць кожнаму вяроўку, каб трымаўся за яе абедзвюма рукамі, выстаўленымі наперад.

2. Даць распараджэнне: ваша задача — утварыць правільны квадрат. Вы можаце размаўляць адзін з адным. Не дазваляецца адпускаць вяроўку. Калі вы адчуеце, што дамагліся мэты, акуратна пакладзіце вяроўку на падлогу, захоўваючы форму, якой вы ёй надалі. Пасля гэтага можаце зняць з вачэй павязкі.

3. Пакуль група з завязанымі вачыма выконвае працу, парайце рэшце ўдзельнікаў: „Уважліва сачыце за працэсам і падумайце, чаму з яго можна навучыцца".

*Абмеркаванне:*

1. Што вы адчувалі, калі выконвалі працу? Ці задаволеныя вынікам? Што можна было зрабіць інакш?

2. А чаму навучыліся вы, пабочныя назіральнікі?

   Звычайна бальшыня груп не просяць дапамогі ў назіральнікаў або настаўніка, якія не маюць на вачах павязкі. А трэба зразумець, што праца можа быць выкананая больш эфектыўна, калі ў ёй возьме ўдзел і супольнасць. (Разам мы можам зрабіць працу нашмат лепш).

*Падсумаванне:*

Мы рабілі практыкаванне „Квадрат" на працу ў камандзе.

Пастаўце самі сабе адзнакі ад 1 да 5 балаў за наступныя дзеянні:

- Генерацыя нестандартных ідэй (творчасць).
- Ператварэнне ідэй у дзеянні.
- Супрацоўніцтва.
- Камунікацыя (уменне дамаўляцца).
- Беларуская мова зносін.
- Наколькі вы аб'ектыўна ацанілі свае вынікі паказвае ваша ўменне вучыцца. Можаце таксама яго ацаніць.

**Сцэнарыі ўрокаў**

# Занятак 1. Стэрэатыпы і традыцыі. Вырашэнне праблем.

## Тэма: КАНФЛІКТЫ.

**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** праектар, мультфільм „Дзед”, https://is.gd/rQavA4.

**Мэта:** вучні навучацца знаходзіць сапраўдную прычыну праблемы ці канфлікту. На прыкладзе мультфільма „Дзед” абмяркуюць традыцыі і стэрэатыпы беларусаў.

**І этап. Актуалізацыя ведаў.**

Якія веды патрэбныя для вырашэння жыццёвых сітуацый, побытавых праблем?

**ІІ этап. Вучымся знаходзіць прычыну праблемы.**

**Практыкаванне „5 Чаму”.**

Вучні разам з настаўнікам знаёмяцца з медыятэкстам (кінастужка, мультфільм, кліп, фота, артыкул і т.п.), дзе вырашаецца канфлікт ці праблема. Пасля знаёмства з медыятэкстам настаўнік прапануе вучням прааналізаваць яго. Аналіз ажыццяўляецца на аснове пяці ўзаемазвязаных пытанняў, якія пачынаюцца са слова „Чаму?”. Адказ на 5-ае пытанне дае інфармацыю аб сапраўднай прычыне праблемы.

Як прыклад, прапануем аналіз мультыплікацыйнага фільма „Дзед” (2011 г., рэжысёр Аляксандр Ленкін): https://www.youtube.com/watch?v=QKeHS4jg9dk



Вось як выглядае пошук прычыны праблемы з дапамогай метаду „5 Чаму".
Настаўнік задае пытанні — вучні прапануюць адказ.

1. Чаму старых людзей адпраўлялі на чоўне ў туман?

   — Бо гэтага патрабавала традыцыя вёскі. Было важна, каб суседзі бачылі, што традыцыі не парушаюцца.

2. Чаму была такая традыцыя?

   — Бо старых цяжка было пракарміць, не хапала ежы, а яны былі без сіл і не маглі дапамагаць па гаспадарцы.

3. Чаму не хапала ежы?

   — Бо маладым не хапала ўменняў і досведу старэйшых, каб эфектыўна весці гаспадарку ў галодныя гады.

4. Чаму маладыя не карысталіся досведам старэйшых?

   — Бо іх адпраўлялі на лодцы паміраць.

5. Чаму ў галодны год сям'і ўдалося выжыць і знайсці сродкі для харчавання?

   — Таму што сталы чалавек даў разумную параду, калі яго не адправілі на лодцы ў туман.

Настаўнік падводзіць вынікі дыскусіі.
Як вырашылася праблема?

У сяле скасавалі традыцыю вывозіць старых людзей на чоўне ў туман, людзі зразумелі, што сталыя — мудрыя людзі, парады якіх могуць быць вельмі карыснымі як для малых, так і для дарослых.

**Заўвага для настаўніка**

Метад „5 Чаму" стварыў Сакіці Таёда — заснавальнік аўтамабільнай кампаніі Toyota. У аснове метаду знаходзіцца дыялог, які будуецца на прапанаваных настаўнікам пытаннях. Пытанні можна падрыхтаваць загадзя, а можна імправізаваць. Кожнае пытанне павінна пачынацца з „Чаму", а новае пытанне ўзнікаць на падставе атрыманых адказаў вучняў. Сакіці Таёда лічыў, што пры правільнай фармулёўцы пытанняў і з улікам іх паслядоўнасці, пяты адказ будзе агучваць прычыну праблемы.

*У залежнасці ад мэты і тэмы ўрока, ланцужок пытанняў можа быць як карацейшым, так і даўжэйшым.*

Гэты метад можа выкарыстоўвацца настаўнікамі на ўроках для абагульнення вучэбнага матэрыялу па тэме заняткаў, у выхаваўчай працы, пры арганізацыі медыяадукацыйных мерапрыемстваў.

Як вынік, у вучняў развіваецца крытычнае мысленне, навыкі вырашэння канфліктаў і развязвання праблем.

**ІІ этап. Вучымся знаходзіць прычыну праблемы самастойна.**

Практыкаванне:

Настаўнік прапануе сапраўдную канфліктную сітуацыю ці праблему, якая блізкая для вучняў, і просіць у групах знайсці яе прычыну.
Праблемы могуць быць наступныя: людзі не сартуюць смецце, беларусы не размаўляюць па-беларуску, у класе дражняць хлопчыка, які носіць акуляры...

Прыклад з занятку, як развязалі праблему дзеці ў 2023 годзе:

- Чаму шмат беларусаў пакінулі сваю краіну ў 2020-2023 гадах?
- Таму, што рэпрэсіі.
- Чаму рэпрэсіі?
- Таму, што Лукашэнка даў загад любым коштам утрымаць уладу.
- Чаму даў такі загад?
- Таму што ён застаўся ва ўладзе, але ведае, што прайграў выбары.
- Чаму ён застаўся ва ўладзе?
- Таму што не працуюць дэмакратычныя механізмы змены ўлады.

Выснова — беларусы выехалі, таму што ў краіне няма дэмакратыі.

**ІІІ этап. Прымяненне ведаў на практыцы. Вырашаем канфлікт.**

Практыкаванне „Апельсін".

Тры добраахвотнікі выконваюць ролі братоў ці сясцёр, якім патрэбны апельсін. Ён толькі адзін і няма магчымасці набыць іншы. Але старэйшаму брату патрэбны костачкі для ўрока біялогіі, сярэдняй сястры цэдра для пірага, а малодшая хоча яго з'есці. (Пра гэта ўдзельнікі не ведаюць).

Група павінна вырашыць канфлікт.

Практыкаванне ідзе да той пары, пакуль дзеці не здагадаюцца задаць пытанне кожнаму ўдзельніку: Чаму табе патрэбны апельсін?

# Занятак 2. Тыпы канфліктаў. Унутраны канфлікт у апавяданні Максіма Гарэцкага „Рускі”.



**Час:** 45 хвілін

**Патрэбныя матэрыялы :** Праектар, ролік https://youtu.be/mUjcEMT46aM (М. Гарэцкі, „Рускі”).

**Мэта:** прадастаўленне магчымасці дзецям атрымаць вопыт канструктыўнага вырашэння канфліктных сітуацый.

**Задачы:**
- разглядзець розныя тыпы канфліктаў, у тым ліку з гісторыі Беларусі;
- навучанне метадам знаходжання рашэння ў канфліктных сітуацыях;
- дапамагчы навучыцца непрадузята ацэньваць канфліктную сітуацыю;
- дапамагчы скарэктаваць свае паводзіны (зняць канфліктнасць у асобасна-эмацыйнай сферы);
- згуртаванне групы, развіццё ўменняў і навыкаў камунікацыі, каманднага ўзаемадзеяння, крытычнага мыслення, вырашэння канфліктаў.

**І этап. Актуалізацыя ведаў.**

Вучні ўзгадваюць якую-небудзь канфліктную сітуацыю са школьнага жыцця ці з літаратуры. Называюць бакі канфлікту, шукаюць прычыну.

**ІІ этап. Тэорыя канфліктаў.**

Прэзентацыя „Канфлікты”, https://docs.google.com/presentation/d/12csGjfU_YYCdsDVs-2ny0NuPMnndnSpi/edit#slide=id.p1

Канфлікт (ад лац.: conflictus — сутыкненне) — найбольш востры спосаб вырашэння супярэчнасцей у мэтах, поглядах.

Канфлікты бываюць:
- міжасабовыя;
- канфлікт паміж асобай і групай;
- міжгрупавыя канфлікты;
- унутраныя.

Вучні прыводзяць прыклады кожнага віду канфліктаў.
Разбіраюць стратэгіі вырашэння канфліктаў.

Настаўнік задае ключавое пытанне: Як вы думаеце, які з канфліктаў самы страшны?



**II этап. Максім Гарэцкі. Канфлікты ў апавяданні „Рускі". Наступствы крызісу ідэнтычнасці.**

1. Актыўнае слуханне. Вучні праслухоўваюць аўдыязапіс апавядання Максіма Гарэцкага „Рускі" і выпісваюць усе канфлікты, якія яны заўважылі.

2. Аналіз апавядання М. Гарэцкага „Рускі".

   Разбор канфліктаў: вызначаюць тыпы канфліктаў, якія там апісаныя, вызначаюць прычыны гэтых канфліктаў, аналізуюць унутраныя канфлікты, якія ёсць у беларуса і ўкраінца.

   Пытанні для абмеркавання

- Якія канфлікты апісвае аўтар (міжгрупавыя [вайна], міжасабовыя, паміж асобай і сістэмай [прымус ісці на чужую вайну], унутраныя [чаму беларус страціў розум?]). Зазначаюць, што міжасабовага паміж беларусам і ўкраінцам не было.

- Вызначыце прычыну кожнага з канфліктаў.

- Чаму ўнутраны канфлікт лічыцца самым цяжкапераадольным? (Для яго не працуюць стратэгіі — са сваім сумленнем не дамовішся).

- Чаму беларус думаў, што ён рускі, а ўкраінец — што ён аўстрыец?

- Назавіце прычыны ўнутранага канфлікту „рускага".

- Як яго можна было б пазбегнуць? (Мець нацыянальную самаідэнтыфікацыю і ўласную пазіцыю, не ісці супраць свайго сумлення, не рабіць амаральныя ўчынкі. Таму існуюць у грамадстве не толькі законы, але яшчэ маральныя нормы — гэта няпісаныя законы).

# Занятак 3. Вучымся вырашаць канфлікты.



**Час:** 45 хвілін.

**Патрэбныя матэрыялы:** Раздаткі.

**Мэта:** пазнаёміцца з канкрэтнымі тэхнікамі паводзін у канфліктах, даведацца пра стратэгіі паводзін у канфлікце і спосабы выхаду з яго.

Адзін філосаф сказаў: „(...) той, хто ўмее ўправіцца з канфліктамі шляхам іх прызнання і рэгуляцыі, бярэ пад свой кантроль рытм гісторыі” (Ральф Густаў Дарэндорф).

**I этап. Актуалізацыя ведаў.**

Якія канфлікты бываюць?
Якія стратэгіі іх вырашэння?
Якія адмоўныя і якія станоўчыя рысы мае канфлікт?

Сёння мы будзем вучыцца на практыцы змяншаць адмоўныя бакі і павялічваць станоўчыя.

**II этап. Дамовімся аб правілах працы ў групе:**

**Тут і цяпер** — прадметам размовы могуць быць толькі эмоцыі, думкі, пачуцці, якія адбываюцца ў дадзены момант.
**Адзін у эфіры** — паважаць меркаванне іншага. Адзін кажа — іншыя слухаюць.
**Прынцып „Я-выказванне”** — „мне здаецца”, „я думаю”. Кожны гаворыць пра сябе, ад свайго імя. Без ацэнкі іншых удзельнікаў.

**III этап. Практыка.**

**Практыкаванне „Рукі”.**

Мэта практыкавання — навучыцца выбіраць эфектыўную стратэгію паводзін у канфліктнай сітуацыі.

Настаўнік просіць злучыць далоні на ўзроўні грудзей, а затым націснуць правай далонню на левую. (Па досведзе правядзення гэтага практыкавання вядома, што левая рука пачынае несвядома аказваць супраціў, хоць такой інструкцыі ці дэманстрацыі такіх дзеянняў не было).

*Абмеркаванне:*

Што вы адчувалі?
Якія адчуванні ў вас узніклі пры выкананні задання?
Што здарылася з левай рукой?
У адказ на (агрэсію) раздражненне мы падсвядома пачынаем супраціўляцца, г.зн. раздражненне нараджае канфлікт, агрэсію.
Калі мы настроены непрыязна ў адносінах да іншых, яны гэта адчуюць і неўсвядомлена прымуць меры абароны.

**Практыкаванне „Іншымі словамі".**

У гэтым практыкаванні прапануецца папрацаваць над неканструктыўнымі ўстаноўкамі ў зносінах з іншымі людзьмі, якія часта прыводзяць да ўзнікнення або разгарання канфлікту. Звычайна нас раздражняе, а часам і проста выводзіць з сябе, калі іншы чалавек кажа нам фразы кшталту: „Ты павінен...", „Гэта твой абавязак...", „З табой немагчыма размаўляць...", „Ты безадказны чалавек".

Гэтыя і падобныя выказванні прыводзяць да ўзнікнення бар'ераў зносін, павелічэння напружання. Таму вельмі важна, асабліва ў канфліктнай сітуацыі, адсочваць неканструктыўныя ўстаноўкі ў зносінах.

Настаўнік раздае лісткі з выказваннямі. Задача вучняў перафармуляваць шэраг неканструктыўных сцвярджэнняў у канструктыўныя.

Напрыклад, „Ты павінен прынесці мне кнігу". (Я была б рада, калі б ты прынёс мне кнігу).

„Ён павінен клапаціцца пра мяне". („Мне хочацца, каб ён клапаціўся пра мяне").

„Ён — упарты асёл". („Я не змог пераканаць яго").

**Раздатка.**
Перафармулюйце фразы так, каб знізіць негатыўныя эмоцыі, напружанне і бар'еры для далейшай размовы.

Прыклад: „Ты павінен клапаціцца пра мяне" — Я б хацеў (-ла) атрымліваць больш увагі ад цябе.

1. „Ты ні разу ў жыцці для мяне нічога не зрабіла!"
2. „Ты павінна была прадбачыць магчымыя цяжкасці"
3. „Мяне пакрыўдзілі!"
4. „Мяне прымусілі".
5. „Ён — упарты асёл".
6. „Ён мяне прынізіў".
7. „Перастань мяне злаваць!"
8. „Ты павінна мне даць гэтую праграму".

Варыянты адказаў.
Абмеркаванне:
Ці проста было перафразаваць?

**Выснова:** Паспяховае вырашэнне любой канфліктнай сітуацыі, непазбежна звязана са здольнасцю дараваць. Ва ўсіх канфліктных сітуацыях кожны чалавек кантралюе выключна свае дзеянні і не можа кантраляваць дзеянні, рэакцыю іншых. Калі вы не даруеце свайму крыўдзіцелю, то шкодзіце толькі самому сабе. Вы можаце прыняць рашэнне выбачыць вашаму крыўдзіцелю незалежна ад таго, прыме ён ваша прабачэнне ці не.

Прабачэнне азначае, што вы „адпускаеце” свой гнеў і не збіраецеся помсціць.

**Практыкаванне „Армрэстлінг”.**

Настаўнік просіць вучняў разбіцца на пары (тройкі — адзін арбітр, які лічыць час і колькасць балаў) і заняць за сталом позу, як у армрэстлінгу. (Лепш паказаць позу, не называючы слова армрэстлінг).

Бал налічваецца пары, калі рука дакранаецца да стала.
Ваша задача набраць як мага больш балаў за 10 секунд.

Падвядзенне вынікаў: Перамагае тая каманда, дзе партнёры дамовіліся не мерацца сілай і не супраціўляцца. У жыцці таксама супрацоўніцтва і перамовы даюць большыя вынікі, чым канкурэнцыя і супрацьстаянне.

**Тэхніка пагашэння канфлікту „Згода”.**

Яшчэ адно практыкаванне, як знізіць накал эмоцый.

Пазбегнуць канфлікту і адказаць на выпад (абраза, абвінавачанне) можна не супрацьстаяннем, што толькі пагоршыць канфлікт, а згодай, пры гэтым не адыходзячы ад сваёй пазіцыі. (Напрыклад: „Ты ніколі не трымаеш узятыя на сябе абавязацельствы!” — „Часам я выконваю свае абавязкі, часам мне даводзіцца іх парушаць”).

**Раздатка.**

**Тэхніка пагашэння канфлікту „Згода”.**

Тэхніка палягае ў тым, каб знайсці ў словах партнёра нешта, з чым можна пагадзіцца, і адказаць на яго выпад (абраза, абвінавачванне, загад) не супрацьстаяннем, што толькі пагоршыць канфлікт, а згодай, пры гэтым, не адыходзячы ад сваёй пазіцыі.

Напрыклад: „Ты зусім з глузду з’ехала!” — „Часам можа здацца, што я дзейнічаю не як звычайныя людзі”.

1. „Ты ніколі не выконваеш тое, што абяцаеш!”
2. „Перастань размаўляць са мной у такім тоне!”

3. „У нашай групе па-сапраўднаму працую толькі я!”
4. „Выбірай: або яна, або я, інакш я з табой не сябрую”.

**Практыкаванне „Каралева”.**

*Практыкаванне-гульню можна правесці на ўроку, падчас факультатыўнага або выхаваўчага мерапрыемства, нават за сямейным сталом.*

**Мэта:** вучні будуць ведаць структуру грамадзянскай супольнасці і функцыі розных сацыяльных інстытутаў: дзяржавы, рэлігіі, прэсы, бізнесу, войска, культуры...

Настаўнік чытае казку.

## Каралева

У адным каралеўстве жылі Кароль і Каралева. Жылі яны ў замку, які быў пабудаваны на выспе пасярод глыбокага возера і акружаны высокім мурам. Да замка вёў шлях праз мост, а каля брамы стаяў Стражнік.

Каралеву, як гэта часта бывае ў каралеўскіх сем’ях, аддалі замуж па разліку, вельмі маладой і супраць яе жадання. Аднойчы Кароль сабраўся ў паход. Перад адпраўкай ён забараніў Каралеве выходзіць з замка і выдаў таемны загад для Стражніка. У ім гаварылася, што з замка можна ўсіх выпускаць, але нельга нікога ўпускаць.

Як толькі Кароль з’ехаў, Каралева, скарыстаўшыся свабодай, выбегла з замка, каб сустрэцца са сваім старым Добрым сябрам, які жыў у навакольнай вёсцы. Там яны добра бавілі час, ім разам было весела і цікава. Але Каралеве трэба было вярнуцца ў замак да прыезду Караля.

Каля варот замка Каралева сустрэла Стражніка, які перапыніў яе.

— Прапусці мяне! — сказала Каралева

— Не! У мяне загад Караля нікога не ўпускаць!

— Але я твая Каралева.

— Я на службе ў Караля і не магу парушаць яго загады.

Каралева зразумела, што ўвайсці ў браму немагчыма і вырашыла скарыстацца таемным ходам, размешчаным з супрацьлеглага боку замка. Але, каб дабрацца да таемнага ходу, трэба было пераплыць вялізнае халоднае возера. На беразе возера быў Лодачнік з лодкай.

Каралева ўзмалілася:

— Дапамажы перабрацца на той бераг!

— Няма праблем, адзін срэбны талер — і Вы на тым беразе!

— У мяне няма з сабой грошай, але я Каралева і, калі ты мне дапаможаш, я шчодра табе аддзячу. Я дам табе 10 талераў, прычым не срэбных, а залатых.

— Мне не трэба 10 потым, я хачу 1 і зараз, — адказаў Лодачнік.

Тады Каралева вырашыла пайсці да сваёй Сяброўкі, каб пазычыць грошай. Сяброўка ў здзіўленні спытала:

— А навошта табе?

Каралева расказала сваю гісторыю ад пачатку і да канца.

— Ведаеш, Каралева, як сяброўку і жанчыну, я цябе разумею. Але ў першую чаргу я маці, у мяне ёсць сын. Я хачу, каб у майго сына ў будучыні Каралём быў сын нашага Караля, а не сын нейкага твайго сябра. Я не буду табе дапамагаць у гэтай справе! — адрэзала ўсе надзеі Сяброўка.

Тады Каралева пабегла ў вёску да Добрага сябра, каб папрасіць грошай.

— Але ж я — бедны селянін, я не магу аддаць табе свае апошнія грошы, а нашы адносіны з табой без абавязацельстваў, — адказаў ёй Добры сябар.

Больш Каралеве не было каму дапамагчы і яна вырашыла рызыкнуць — праскочыць у вароты, калі Стражнік куды-небудзь адыдзе. Дачакаўшыся моманту, яна ірванула ў вароты, але Стражнік быў вельмі дасведчаным і спрытным. Ён хутка вярнуўся, ударыў Каралеву сваёй дзідай, яна звалілася з моста і загінула.

І зараз галоўнае пытанне: Хто вінаваты ў трагедыі?

Кароль
Каралева
Стражнік
Лодачнік
Добры сябар
Сяброўка

**II этап. Індывідуальная работа.**

Заданне: Кожны вучань павінен ацаніць віну кожнага персанажа ў ступені змяншэння віны ад 1 да 6.

1 — найбольш вінаваты
6 — найменш вінаваты.

Свой варыянт адказу трэба абгрунтаваць: чаму вы так лічыце?

**III этап. Праца ў групах.**

Вучні аб’ядноўваюцца ў групы па 3-5 чалавек і выпрацоўваюць агульнае меркаванне групы наконт ступені вінаватасці ў трагедыі кожнага персанажа казкі.

**IV этап. Выпрацоўка агульнага меркавання.**

Кожная група вылучае свайго прадстаўніка. Ім даецца пяць хвілін на выпрацоўку агульнага рэйтынгу. У гэты час настаўнік дае заданне астатнім удзельнікам моўчкі назіраць за працай сваіх прадстаўнікоў — наколькі настойліва і аргументавана яны адстойваюць меркаванне групы. (Добра, каб прадстаўнікі груп не ведалі пра тое, што астатнія сочаць за іх паводзінамі.)

**V этап. Падсумаванне.**

Настаўнік дае расшыфроўку і пытаецца, як гэты казачны персанаж мог выратаваць Каралеву.

**Казачнае Каралеўства — гэта мадэль будовы грамадства. Кожны персанаж увасабляе пэўны сацыяльны інстытут або сферу.**

1. Кароль — гэта дзяржава — той, хто выдае загады, піша законы, у каго ўлада. Інтарэсы дзяржавы павінны супадаць з інтарэсамі грамадства. Што Кароль мог зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? (Паважаць свабоду і інтарэсы Каралевы, не жаніцца на маладой супраць яе волі, адпусціць яе, не даваць Стражніку недакладныя і таемныя загады...).

2. Каралева — грамадзянская супольнасць, народ. Каралева не хацела жыць у несвабодзе, таму парушыла загад. Што яна магла зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? (Уплываць на Караля, патрабаваць справядлівых ясных законаў, магла не вяртацца ў замак, мець уласныя грошы...)

3. Стражнік — сілавыя структуры, той, у каго зброя. Што ён мог зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? (Стражнік перавысіў свае паўнамоцтвы, і выконваў непразрысты дурны загад, які даў Кароль таемна.) Сілавыя структуры ў здаровым грамадстве моцна кантралююцца.

4. Лодачнік — бізнес. Гэта эканамічная сфера грамадства. Што ён мог зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? (Рызыкнуць і зарабіць больш грошай, перавезці каралеву бясплатна...) Бізнес павінен быць сацыяльна-адказным, г.зн. не толькі клапаціцца пра прыбытак і плаціць падаткі, але і ахвяраваць на дабрачыннасць. І наогул — грошы пахнуць.

5. Сяброўка — інстытуты маралі (рэпутацыі). Можна папрасіць вучняў самастойна назваць інстытуты маралі ў сучасным секулярызаваным грамадстве: прэса, сям’я, царква... Запытацца, ці яны мяняюцца. Што Сяброўка

магла зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? (Разумець, што чалавечае жыццё — найвышэйшая каштоўнасць.)

**6.** Добры сябар — інстытуты культуры, хобі, забавы... Што ён мог зрабіць, каб пазбегнуць трагедыі? Культура павінна мець каштоўнасны грунт, не быць аддзеленай ад маралі.

Пасля расшыфроўкі настаўнік просіць вучняў паглядзець на свой першапачатковы рэйтынг казачных персанажаў, наколькі ён супадае з фінальным варыянтам. Ці хто памяняў меркаванне? Просіць даць зваротную сувязь (пажаданні) прадстаўнікам груп, якія выпрацоўвалі канчатковы спіс.

**Практыкаванне „Незалежнасць — гэта...”**

Практыкаванне можна правесці напярэдадні 25 сакавіка, калі беларусы адзначаюць Дзень незалежнасці.

**1.** Настаўнік просіць кожнага напісаць на аркушыку паперы працяг фразы „Незалежнасць — гэта...” На працу даецца 5-7 хвілін. Потым вучні па чарзе зачытваюць свае азначэнні.

**2.** Настаўнік раздае раздрукоўку апавядання Уладзіміра Арлова „Незалежнасць — гэта...” *(https://knihi.com/Uladzimir_Arlou/Niezaleznasc_-_heta.html)*, якое аўтар напісаў у 1990 годзе, калі Беларусь яшчэ не была незалежнай дзяржавай. Настаўнік просіць сачыць за тэкстам, калі ён паставіць аўдыязапіс гэтага апавядання, і адзначаць у тэксце „+” — тое, што ўжо спраўдзілася, „-” — што застаецца актуальным дагэтуль. (Аўдыязапіс тут *https://www.youtube.com/watch?v=ayA6umLeftM)*

**3.** Пасля праслухоўвання, вучні па чарзе зачытваюць тэкст сказ за сказам і выказваюць сваё меркаванне, наколькі гэты факт застаецца актуальным.

**4.** У якасці падсумавання вучням прапануецца прагледзець ролік „Абвяшчэнне БНР”, *https://youtu.be/2ngWePHUdTc*



# Чырвоныя Шапачкі

На аснове сцэнарыя Зофіі Вуйцік.
Пераклад і апрацоўка сцэнарыя Аліна Ваўранюк.

спасылка на спектакль https://www.youtube.com/watch?v=Jj35B-buBFg

**Выступаюць:**
Чырвоная Шапачка
Воўк
Гаёвы
Негрыцянка
Індыянка
Італьянка
Немка
Каўбойка
Арабка

*На сцэну выходзяць усе* **Чырвоныя Шапачкі**, *разглядаюцца.*
— Лес шуміць, равуць каровы,
Дзе Гаёвы? Дзе Гаёвы?

**Чырвоная Шапачка** *(плача)*
— Згубіла дарогу да бабулі... Хто мне дапаможа? Згубіла дарогу да бабулі...
Згубіла сцяжынку! Згубіла сцяжыначку... У-у-у-у-у-у... згубілася! Згубіла...



**Гаёвы**
— Ну, не раві, Чырвоная Шапачка... Чуеш? Не раві так голасна, бо мне ўсіх звяроў напужаеш... А сціхні ты нарэшце!

**Чырвоная Шапачка**
— Але, я загубленая... у-у-у-у...

**Гаёвы**
— Не загубленая, а заблуджаная. А да бабулі ідзецца так: звернеш за гэтым дубам улева... потым...

**Чырвоная Шапачка**
— Але я і так не пападу... у-у-у-у-у...

**Гаёвы**
— Якое пута! Хадзі... *(выходзяць)*

**Чырвоныя Шапачкі**
— Лес шуміць, равуць каровы.
Вельмі стойкі наш Гаёвы!

**Воўк**
— Ну, і не паспеў! Не паспеў! Адпачну хвілiначку і зараз жа даганю гэтую раўлівую Шапачку. Як я магу ўсюды паспяваць? Бабулі ва ўсім свеце расказваюць сваім унукам казку пра Чырвоную Шапачку. Гэтых Шапачак многа, а я толькі адзін. Бегаю ад адной да другой казкі і ледзь паспяваю. Як адзін Воўк можа паспець і тут, і там? І тут... і там... там... там... Там-там? Адкуль тут тамтам?!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Лес шуміць, зямля трасецца...
Нешта дзіўнае пачнецца?

**Негрыцянка**
— Там, там, там! Та-та-та, там!
Там, там, там! Та-та-та, там!

**Воўк**
— А каго ж бачаць мае прыгожыя вочы?

**Негрыцянка**
— Вітаю вас, спадар Воўк!

**Воўк**
— Што ты тут робіш?

**Негрыцянка**
— Як заўсёды, звычайна іду да бабулі. Сёння ёй споўніцца сто гадоў!

**Воўк**
— Але ж гэта не твой лес!

**Негрыцянка**
— Але бабуля мая! Нясу ёй розныя ласункі. Лепш пакажы мне дарогу, бо зараз жа пачну раўці!

**Воўк**
— Не! Годзе ўжо гэтых равучых Шапачак. Ідзі гэтай дарогай.

**Негрыцянка**
— Ужо бягу, спадар Воўк. Бай! І не забывайце, што я і бабуля чакаем вас...

**Воўк**
— Якім чынам Чырвоная Шапачка з афрыканскага бушу папала ў гэты лес? Цяпер мушу пажэрці дзве Чырвоныя Шапачкі... Ой-вой!

*Чуваць індзейскія воклічы.*

Ратуйце! Аблава! Мне трэба неадкладна схавацца!

**Індыянка**
— Прашу прабачэння ў Вельмі Загарэлага Твару! Я Чырвоная Шапачка.
**Негрыцянка**
— Што-о-о? Ты памыляешся, мая размаляваная сяброўка! Чырвоная Шапачка — гэта я!

**Італьянка**
— О мама мія! Усе вы падурэлі! Хто Чырвоная Шапачка? Хто?

**Індыянка**
— Вусны Бледных Твараў маняць. Мая бабуля дала мне званне Чырвоная Шапачка, як я толькі што нарадзілася...

**Італьянка**
— Супакойцеся! Прэсто! Прэсто! А каму я нясу піцу, пасташуту і мульці мільёні макароні?

**Арабка**
— Алах пакараў мяне за непаслухмянасць і я паблытала дарогу! Не ведаеце, дзе мазанка маёй бабулі?

**Італьянка**
— О мама мія! Я адурэю! Калі вы Чырвоныя Шапачкі, то кім я буду? Баста! Баста!

**Каўбойка**
— Югу-у-у! Я прыбываю з Тэхаса! Толькі што скончылі радэа. Нясу маёй бабулі гамбургер з Макдональдса!! Ну, чаго так разявіліся? Чырвоную Шапачку не бачылі?

**Арабка**
— Алах вялікі! Алах усёмагутны! Мяне ён абраў Чырвонай Шапачкай! Не аспрэчвай Алаху, дарагі іншаземец.

**Негрыцянка**
— Не! У такі спосаб мы ніколі не дагаворымся! Раю вам пашукаць Ваўка. Ён ведае Чырвоную Шапачку, няхай нам дапаможа.

**Індыянка**
— Вусны вельмі Загарэлага Твару добра раяць!

**Італьянка**
— Ну, над чым тут дыскутаваць? Маем шукаць, дык шукайма! Прэсто!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Замест плёску ручайка — гул чырвоных.
Нам пара!
Я іду праз гэты лес і нікога не баюся!
Мацюком я налякаю, хто ў дарозе замінае.
Адважней мяне няма, бо бабуля там сама.
Нясу ёй таблеткі, ласункі і кветкі.
Посуд ёй памыю, пярынкай прыкр-р-рыю.
Ведаюць усе, а дурны Воўк не!

**Воўк**
— А чаго я не ведаю?

**Чырвоныя Шапачкі**
— Не ведаеш, дзе жыве бабуля.

**Воўк**
— Дык скажы!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Не скажу!

**Воўк**
— А чаму не скажаш?

**Чырвоныя Шапачкі**
— Бо мая бабуля добрая, а ты з'ядаеш усё, што добрае.

**Воўк**
— А з вамі няма сэнсу далей гаварыць!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Чаму?

**Воўк**
— Бо з такім натоўпам не магу весці размовы! Не маю ніякага шанцу! Мушу хвіліну падумаць. Ідзіце адпачыць — туды, за кусты і дазвольце старому Ваўку трошкі падумаць. І не сварыцца!

*Чырвоныя Шапачкі выходзяць.*

**Воўк**
— Які беспарадак! Якое бязладдзе! Як я іх усіх паз'ядаю?

**Гаёвы**
— Здавайся люты ваўчышча!

**Воўк**
— А ідзіце к чорту, пан Гаёвы. Якраз мне ў галаве гульня ў жмуркі! Лоб ужо трашчыць!

**Гаёвы**
— Ну, дык што будзем рабіць? Неяк нуднавата.

**Воўк**
— Нуднавата!? А дзе ж вы былі, пан Гаёвы?

**Гаёвы**
— Па лесе хадзіў... Вавёрак лічыў... Думаў, ты ўжо пажор Шапачку...

**Воўк**
— Якую?

**Гаёвы**
— Гавару пра Чырвоную...

**Воўк**
— Але пра каторую?

**Немка**
— Гутэн таг, Гэр Вольф!

**Гаёвы**
— А маць святая!

**Воўк** *паказвае накірунак.*

**Немка**
— Яволь!

**Гаёвы**
— Вы нешта скрываеце, спадар Воўк! Я Гаёвы і мушу ведаць, што тут адбываецца!

**Італьянка**
— Спадар Воўк, не думаю даўжэй чакаць. Прашу прэсто нешта зрабіць!!!

*Воўк млее.*

**Чырвоныя Шапачкі**
— Усе кусты трашчаць: трах, трах!
Быў ён Воўк, цяпер — мярцвяк!

**Італьянка**
— О мама мія! О Санта Мадонна!

**Гаёвы**
— Памажыце! Ратуйце!

**Італьянка**
— Э-ей! Ідзіце сюды!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Чырвоныя і Шапачкі ў дарогу нам пара.
У кошычках канапачкі і пляшачка віна.

**Гаёвы**
— А адкуль вы ўзяліся? А што вас так цешыць? Вельмі проста путацца па лесе і дзерціся! А стары Воўк паплаціцца інфарктам! Ці вы не ведаеце, чырвоныя бестыі, што Воўк пад аховай?

**Негрыцянка**
— Хвіліначку, адну хвіліначку! Я ведаю такі вершык... Можа ён павесялее? «Ідзе рак, небарак, як ушчыпне — будзе знак!»

**Італьянка**
— А ідзі ты ўтапіся!

**Каўбойка**
— А можа гэты? «Косі, косі лапкі. Паедзем да бабкі...»



**Немка**
— А ідзіце ж прэч адсюль! Не дабівайце яго!

*Воўк стогне.*

**Каўбойка**
— Трэба нешта прыдумаць!

**Немка**
— Бураму Ваўку дапамагчы і сябе выратаваць!

**Негрыцянка**
— Ну, дык абмяркоўваем!

**Індыянка**
— Чырвоныя Шапачкі ўсіх краін — яднайцеся!

*Ідуць у бок сцэны.*

**Гаёвы**
— Эй, спадар Воўк, спадар Воўк.

**Воўк**
— Ну што?

**Гаёвы**
— Вы сапраўды паміраеце, ці толькі прытвараецеся?

**Воўк**
— Т-с-с-с... Мне нічога, але думаць не хочацца. Няхай самі нешта прыдумаюць.

**Чырвоныя Шапачкі**
— Вецер вее! Лес гудзіць!
Што рабіць? Што рабіць?

**Каўбойка**
— О’кей! О’кей! Ну і што?

**Немка**
— Нарэшце будзе парадак.

**Арабка**
— Але ж парадак гэта не ўсё.

**Індыянка**
— Бледны Твар не разумее? Нам трэба дапамагчы...

**Італьянка**
— Так, так, мы ўжо ж гэта гаварылі!

**Негрыцянка**
— Я буду Чырвоная Завушніца... У мяне леў. Ён ахвотна дапаможа Ваўку.

**Немка**
— А я маю свайго мядзведзя ў Берліне. А буду звацца - Чырвоная Хустачка.

**Індыянка**
— А я вырашыла стаць на ваенную сцежку з хутканогай пумай.

**Італьянка**
— А тваё імя. Як будзеш звацца?

**Індыянка**
— Так, як хацеў мой дзядуля — Чырвонае Пяро.

**Італьянка**
— Прыгожа... і так рамантычна. Думаю цяпер пра сваё імя... Хіба Чырвоны Шаль...

**Каўбойка**
— А хто ў тваёй краіне заступіць Ваўка?

**Італьянка**
— Над гэтым будзе думаць мая сям'я з Сіцыліі. Яны напэўна нешта прыдумаюць.

**Каўбойка**
— Добра мець такую сям'ю... Я сама мушу ўсё вырашаць.
О'кей! Буду звацца Чырвонае Ласо.
А каёт заступіць Ваўка. Ну, як?!

**Усе**
— О'кей!

**Арабка**
— Хіба Алах дазволіць мне звацца Чырвоны Турбан.

**Каўбойка**
— Дык чаго мы чакаем? У дарогу!

**Чырвоныя Шапачкі**
— Не Буркі і не Муркі, не птушкі, не сланы.
Чырвоныя Шапачкі — таксама не мы.
У нас свае казкі, мы будзем жыць у іх!
Не трэба нам падказкі, не трэба нам маны!
Не Буркі і не Муркі, не птушкі, не сланы.
Чырвоныя Шапачкі — гэта не мы!

**Воўк**
— Пайшлі?

**Гаёвы**
— Так, можаце ўставаць.

**Воўк**
— Якая прыемная цішыня.

**Чырвоныя Шапачкі**
— Льецца дожджык: лі, лі, лі.
Лаві Шапачку, лаві!

**Воўк**
— Пакіньце мяне ў спакоі!

**Гаёвы**
— Спадар Воўк! Што мы зрабілі! Няма ўжо нашай казкі!

*Чуваць плач.*

**Чырвоныя Шапачкі**
— Лес шуміць, равуць каровы.
Бэкса, плакса наш Гаёвы!

**Воўк**
— Не раві!

**Гаёвы**
— Не раву!

**Воўк**
— А хто раве?



**Чырвоная Шапачка**
— Я!

**Воўк**
— О мама мія! О Санта Мадонна!
Дзякуй, Алах!
Буда прыгожы! Жонка Гаёвага! Глядзіце!

**Гаёвы**
— Вачам сваім не веру! Шапачка! Сапраўдная Шапачка!

**Чырвоная Шапачка**
— Ці вы не хворыя?

**Гаёвы**
— Не, не, усё добра. Але чаму ты плачаш, дзіцятка?

**Чырвоная Шапачка**
— Бо чакаем з бабуляй Ваўка. Чакаем, выглядаем, а яго няма!

**Воўк**
— Бяжы дзіця да бабулі! Неўзабаве прыйду да вас!

**Гаёвы**
— Уратаваныя! Мы выратаваныя! І наша казка выратаваная.
Ну, бяжыце спадар Воўк! І спяшайце! Буду там праз пятнаццаць хвілін!

**Усе**
— Свеціць сонца, рвуцца коні!
Цяпер пляскайце ў далоні!



# Змест

**Карэктура:** Віталь Луба
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі
**Рэдактар:** Мікола Ваўранюк

**Выдавец:** Аб’яднанне ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА

**Друк:** Koncept Białystok

**Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji**

**Publikacja wyraża jedynie poglądy autora/ów i nie może być utożsamiana z oficjalnym stanowiskiem Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.**

**Публікацыя выражае толькі меркаванні аўтара(аў) і не можа атаясамлівацца з афіцыйнай пазіцыяй Міністра Унутраных Спраў і Адміністрацыі.**

**Аліна Ваўранюк**
АД НАСТАЎНІЦЫ — **5**

**Ірэна Матысюк**
ЯК ПАЙДУ НА ПРАЎДЗІВУ ЭМЭРЫТУРУ... — **7**

**Мікола Ваўранюк**
ГОЛАС МЕНШАСЦІ — **19**

**Тамара Мацкевіч**
МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ КУРСА „БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА” ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ — **23**

**Тамара Мацкевіч**
РОЛЯ АДУКАЦЫІ ДЛЯ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА — **25**

**Тамара Мацкевіч**
КАНФЛІКТЫ — **32**

**Аліна Ваўранюк**
„ЧЫРВОНЫЯ ШАПАЧКІ” НА АСНОВЕ СЦЭНАРЫЯ ЗОФІІ ВУЙЦІК — **44**